ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
9 08 2018 г.

SEX=БАЛЯСЫ

ДЭФІЛЕ ЗДОЛЬНАСЦЯЎ

Памятаеце ж нядаўнюю навіну пра тое, што арганізатары конкурсу «Міс Амерыка» прыбралі з яго праграмы дэфіле ўдзельніц у купальніках? Тое, што так падабаецца мужчынам і што выкарыстоўваецца ў якасці «цяжкай артылерыі» самімі прадстаўніцамі другой паловы чалавецтва. А ці не для гэтага відовішча «Міс Амерыка» калісьці і задумвалася? («Задача жанчыны — прыкрыць цела адзеннем такім чынам, каб яго было максімальна бачна».) «Мы больш не беззмястоўнае шоу, мы — спаборніцтва», заявіла кіраўнік апякунскага савета конкурсу. Во як! А мы ж да гэтага часу думалі, што і раней канкурсанткі менавіта спаборнічалі паміж сабой, дэманструючы грацыю, прыгожае дагледжанае цела, што, зразумела, без здаровага ладу жыцця і спорту за рэдкім выключэннем немагчыма. («Аказваецца, Даша, хадзіла не дарэмна. Вунь якія ногі накачала».)

Далей кіраўніца распавяла, што да іх паступала шмат зваротаў дзяўчат, якія вельмі хацелі б паўдзельнічаць у конкурсе, але, маўляў, не хочацца разгульваць на абцасах і ў бікіні. Гэта што — залішняя сціпласць ці нешта іншае? («Увогуле, я за здаровы лад жыцця, але ў мяне гнуткі графік».) Не хочаш хадзіць па сцэне ў купальніку, апранай робу і ідзі на прафесійнае спаборніцтва зваршчыкаў! («— Доктар, як хутка прыбраць жывот? — Павярніцеся спінай!») Што, несправядліва? А ці справядліва мяняць правілы пад сябе? («Бландзінка заходзіць у бібліятэку і звяртаецца да работнікаў: — Мне, калі ласка, каву і дзве булачкі. — Дзяўчына, што вы сабе дазваляеце?! Гэта ж — бібліятэка!!! — Вой, прабачце, (ужо шэптам) мне, калі ласка, каву і дзве булачкі!») Калі хочацца бліснуць найперш розумам і кемлівасцю — паўдзельнічай у інтэлектуальным конкурсе. І, як падаецца, арганізатары «Міс Амерыкі» з нейкіх прычын хочуць перавесці яго менавіта на гэтыя «рэйкі».

Замест дэфіле ў купальніках дзяўчатам трэба будзе гутарыць з членамі журы на самыя розныя тэмы. Прадэманстраваць, як той казаў, свой багаты ўнутраны свет. Думаеце, атрымаецца? («Калі лічыце, што вас кінулі, таму што вы занадта разумная, значыць, вы — дурніца».) Таксама канкурсанткі больш не будуць выходзіць у вячэрніх сукенках, а змогуць выкарыстоўваць тое адзенне, якое, на іх погляд, максімальна адлюстроўвае асабісты стыль. («Калі твая дзяўчына пытаецца, ці не тоўстая яна, максімальна хутка арыентуешся і: «Хто тоўстая? Ты тоўстая? Не смяшы мяне. Ты самая худая. Вось сяброўкі твае тоўстыя. Мае знаёмыя бабы таксама. Ды і сам я тоўсты. Але самая тоўстая — мая ранейшая. А ты не».) Згодна з новымі правіламі «Міс Амерыка» павінна прайсці ўжо ў верасні. І дарога туды адкрыецца абсалютна для ўсіх? Цікава, намінацыі ў конкурсе таксама зменяцца? («Не слухай іншых, дзяўчынка. Ты самая прыгожая. У сваёй вагавой катэгорыі».) Ну ды бог з імі, гэтымі змяненнямі. Уласна, я нагадаў навіну пра «Міс Амерыка» вось дзеля чаго.

Літаральна некалькі тыдняў таму стала вядома, што ўпершыню ў гісторыі конкурсу каралевай прыгажосці стала... 60-гадовая ўдзельніца. Здавалася б... («У Адэсе: — Мадам, ды з вас ужо пясок сыплецца! — Зусім гэта не пясок... Гэта такі не згарэўшы ў маладосці порах».) Дык вось не! У конкурсе «Місіс Свету — 2018» пераможцам у такім паважаным узросце прызналі жыхарку Аўстраліі Робін Кэнер **(на здымку)**. («Патрабуем павысіць бальзакаўскі ўзрост для жанчын».) Калі яна падавала заяўку на ўдзел, сяброўкі круцілі пальцам каля скроні, маўляў, куды ты лезеш, на «Місіс Свету» спрабуюць прабіцца жанчыны ў раёне крыху за 30, у цябе няма шанцаў. Але ў выніку Робін абышла маладзейшых канкурэнтак, чый мінімальны ўзрост складаў 26 гадоў, і стала самай узроставай каралевай прыгажосці за ўсю гісторыю конкурсу. Вы ўяўляеце, як трэба было выглядаць, каб выйграць яго?! («Аб'ява ў адэскай газеце: «Жанчына ў самым саку шукае добрую сокавыціскалку».)

Безумоўна, справа была не толькі ў адной знешнасці. Хоць пагадзіцеся, найперш гэта прыцягвае ўвагу, асабліва на фоне заяў арганізатараў конкурсу «Міс Амерыка». («У свае 7.30 я выглядаю на 60».) Адзін з членаў журы потым сказаў, што пераможца скарыла суддзяў не толькі яркай знешнасцю і выхадамі на дэфіле (!), але і асабістым аповедам. («Коратка пра сябе: гаспадарная, як мыла, простая, як аловак, ручная, як граната».) Не ўсё проста было ў жыцці Робін: памёр ад раку яе 22-гадовы сын... У нейкай ступені гэта і падштурхнула маці да ўдзелу ў конкурсах прыгажосці. Жанчына працуе фізіятэрапеўтам, супрацоўнічае з дабрачыннымі арганізацыямі і прыцягвае сродкі на даследаванне анкалогіі. Вось у каго багаты ўнутраны свет! («З узростам сумоўі ўсё больш нагадваюць вочныя стаўкі».) Сама Робін сказала, што конкурс даў ёй упэўненасць у сабе і апору, каб устаць і ісці далей. «Узрост — не кляймо. Нягледзячы на тое, што здарылася ў вас у жыцці, вы заўсёды можаце зрабіць нешта неверагоднае», лічыць «Місіс Свету — 2018». («Усё, што нас не забівае, можна яшчэ разок».)

...Гэтым летам у сеціве можна было ўбачыць здымкі многіх славутых людзей на адпачынку ў бікіні. 60-гадовай Шэран Стоўн, 71-гадовай Таццяны Васільевай, 82-гадовай Святланы Дружынінай... Іх фігурам можна было толькі пазайздросціць. А пра ўнутраны свет «зорак» мы ведалі і дагэтуль па іх творчасці. Вось гэта сапраўднае дэфіле!

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«ДЫХАЕМ» З МУЖАМ АДНОЙ ТЭМАЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Складана было запусціць уласны брэнд?

— Не тое слова. Калі пачыналі, было страшна, бо гэта скачок у невядомасць: атрымаецца ці не? Я разумела, што трэба будзе працаваць 24 гадзіны ў суткі без выхадных. Не толькі сядзець за машынкай — шукаць пакупнікоў, расказваць ім пра сваю прадукцыю. Спачатку я яшчэ шыла на заказ, але вырашыла адмовіцца ад гэтага, бо ў тых рэчах не было маёй ідэі — ты проста выконваеш пажаданні кліента. У выніку мы зрабілі невялікую калекцыю, зладзілі ёй прафесійную фотаздымку і выставіліся на маркеце (кірмашы дызайнераў. — **Аўт.**).

Тры гады мы нікуды не выязджалі, ва ўсім сабе адмаўлялі — усё ўкладалі ў справу. Але ведалі, на што ідзём. Ты павінен умець спраўляцца з праблемамі і, каб нечага дасягнуць, не сядзець і плакаць, а ісці наперад. Для нас самым складаным аказалася бухгалтэрыя — мы вырашылі, што лепш наняць прафесіянала, які будзе ёй займацца.

— Тое, што вы муж і жонка, дапамагае ў рабоце?

— Вельмі. Мы задаволены, што так здарылася. Мы «дыхаем» адной тэмай. Я не ўяўляю, каб у мяне муж быў нейкай іншай спецыяльнасці — наўрад ці ён бы так мяне разумеў. Сказаў бы: кідай гэта ўсё, ідзі на нармальную работу ці займайся домам. А так, калі нешта не атрымліваецца, мы пасмяёмся і супакоім адно аднаго: яшчэ заробім...

У нас падзел абавязкаў. Я адказваю за фасон і пасадку, Саша — за дэкор. Плюс муж займаецца дакументамі. Але тканіны выбіраем разам — у нас такія спрэчкі разгараюцца!

Адзін дзень у тыдзень — нядзелю — стараемся прысвяціць сабе. Ходзім у кіно, шпацыруем па парку, на веласіпедах катаемся, наведваем выстаўкі. Але ўсё роўна адкрываеш сацыяльныя сеткі і адказваеш на пытанні пакупнікоў: людзі чакаць не будуць.

— Якія з вашых рэчаў сталі самымі папулярнымі?

— Світшоты і сукенкі з саламяным конікам. Гэта вышыўка — народная любоў. Некаторыя купляюць і кажуць, што гэта траянскі конь *(усміхаецца)*.

— А як нарадзілася ваша калекцыя #Synoptik, прысвечаная беларускаму надвор'ю?

— Падчас тыдня моды мы паўдзельнічалі ў інсталяцыі, каб заявіць пра сябе, і выйгралі там грант ад кампаніі LG — тры тысячы долараў. Усе яны адразу пайшлі на тканіну: па ўмовах конкурсу мы павінны былі зрабіць калекцыю. Памятаю, у прэс-рэлізе былі радкі пра тое, што ранкам мы глядзім надвор'е і робім выснову, што сёння надзенем. Саша сказаў: «Вось гэта тэма». Пакупнікам калекцыя таксама спадабалася. Людзі вельмі палюбілі куртку з картай атмасферных франтоў.

Калекцыі распрацоўвае сямейны тандэм.

— Як часта абнаўляеце калекцыю?

— Цалкам — раз на паўгода. Плюс у прамежках выпускаем нейкія навінкі. Наогул фабрыкі рыхтуюць новыя калекцыі чатыры разы на год, але для гэтага патрэбны вялікі штат, які будзе адшываць усю лінейку адзення — курткі, штаны, блузкі. У нас такой задачы не стаіць: мы маленькая студыя і займаем сваю нішу.

— Аналізавалі, хто вашы пакупнікі?

— Гэта моладзь ад 25 гадоў. Але цікавяцца рэчамі і людзі ва ўзросце. На адным з маркетаў да нас падышла бабуля гадоў 80-ці. Прымерыла дажджавік і сказала: «Бяру». Спакойна аддала за яго 200 рублёў.

Раней мы рабілі і мужчынскія рэчы, але зразумелі, што трэба звузіць кірунак, бо не паспяваем адшываць і тое, і тое. Пакінулі толькі майку і світшот. Дый хлопцы, як правіла, не абнаўляць гардэроб так часта, як дзяўчаты.

— Вы сочыце за сусветнымі подыумамі?

— Абавязкова. Важна быць у трэндзе, бо можна захраснуць у сваім сусвеце, а ўсе пойдуць наперад. Для дызайнера дзіўна не глядзець паказы. Мы сочым за ўсімі брэндамі, бо галоўныя мастакі часта пераходзяць з аднаго моднага дома ў другі і за сабой перацягваюць стыль — за гэтым цікава назіраць.

Усе фабрыкі купляюць вялікія кнігі з трэндамі наступных сезонаў. Каталог дарагі, пад тысячу долараў, але інфармацыя ў ім каштоўная. Мы таксама стараемся абзаводзіцца трэндамі — у нас ужо ёсць тэндэнцыі на 2020 год.

— Ці бывае, што няма натхнення?

— Такое здараецца, калі вельмі стамляемся ад працы. Таму стараемся адключацца. Я прыходжу дадому і не думаю пра работу. З васьмі-дзевяці вечара не заходжу ў інтэрнэт — збіраю пазлы, чытаю, гуляю з катом, хаджу да сяброў у госці. Вось Саша не можа адключыцца — ён вельмі ідэйны.

«Я не ўяўляю, каб у мяне муж быў нейкай іншай спецыяльнасці — наўрад ці ён бы так мяне разумеў».

— Мінчан можна назваць моднікамі?

— Так. За апошнія тры-чатыры гады гараджане вельмі змяніліся. Можа, на гэта паўплывала адкрыццё новых крамаў — яны прывезлі моду. І гэта здорава. Знешні выгляд — таксама важны аспект. Ад гэтага залежыць і твой настрой, і як дзень пройдзе, і як акружэнне цябе ўспрыме. Што б ні казалі, а людзі заўсёды глядзяць на тое, у што ты апрануты.

— Напэўна, у дызайнера не бывае праблемы з выбарам убораў?

— Не. Прыходжу ў студыю і кажу: мая шафа *(смяецца)*. Я нашу адзенне толькі нашага брэнда. Ужо тры гады не набываю рэчаў — нават зімовы пухавік. Мы неяк шылі іх, адзін быў няўдалы — я яго сабе і пакінула.

— Каго хацелі б апрануць?

— Збіраліся гісторыку моды Аляксандру Васільеву дажджавік падарыць, калі ён на адкрыццё сваёй выстаўкі ў Мінск прыязджаў, але не паспелі... Наогул ёсць такі чалавек, якога хацелі б апрануць, — вельмі вядомы, жыве недалёка. Але пакіну імя ў сакрэце. Ён атрымае падарунак ад нас у верасні, няхай гэта будзе для яго сюрпрызам.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота з архіва дызайнераў.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 08.08.2018 г.